**Список цитируемых источников**

1. Литературоведческий словарь-справочник / Р. Т. Громяк [и др.] ; под ред. О. З. Лебедевой-Гулей. — Киев : Академия, 2007. — 751 с.
2. *Дуктова, Л. Г.* Художественная анималистика: к вопросу определения термина (на примере произведений белорусской литературы ХХ века) [Электронный ресурс] / Л. Г. Дуктова // Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова. — 2009. — Режим доступа: http://libr.msu.mogilev.by/bitstream/123456789/1442/1 . — Дата доступа: 28.09.2016.
3. *Коблякова, Г. А.* Анималистическая литература / Г. А. Коблякова // Альманах соврем. науки и образования. — 2010. — № 12 (43). — С. 208—210.

УДК 80:37

**М. С. Богуш**
*Установа адукацыі «Баранавіцкі дзяржаўны ўніверсітэт», Баранавічы*

# ВОБРАЗ ДАРОГІ Ў ТРЫЛОГІІ Я. КОЛАСА «НА РОСТАНЯХ»

**Уводзіны.** Трылогія Якуба Коласа «На ростанях» з’яўляецца адным з лепшых узораў мастацкай прозы. У гэтым творы пісьменнік паўстаў не толькі мастаком слова, але і гісторыкам, філосафам беларускага шляху.

Трылогія, высокаідэйная па змесце і высокамастацкая па форме, насычана шматлікімі архетыпамі: лес, балота, дарога, поле. У мастацкім плане ўсе гэтыя вобразы знаходзяцца ў адзінстве, як бы матэрыялізуецца бачная паэзія лясоў, рэк, палёў, дарог. «І ўся гэта вялікая разнастайнасць зліваецца ў адзіную мелодыю вечнай песні пра вечную прыгажосць, ва ўрачысты гімн прыродзе, роднай зямлі» [5, с. 54]. Пейзаж займае значнае месца ў трылогіі. Колас добра разумеў невычэрпнасць, бяздоннасць загадак прыроды. Прасачыць погляды Я. Коласа на прыроду — значыць знайсці ключ да разумення філасофскай і этычнай асновы яго творчасці. Без гэтага немагчыма пранікнуць у паэтычны свет мастака, зразумець глыбіню яго народнасці і патрыятызму.

**Асноўная частка.** Прырода для Я. Коласа — гэта «найцікавейшая кніга, якая разгорнута перад вачыма кожнага чалавека. Чытаць гэту кнігу, умець адгадаць яе мнагалучныя надпісы — хіба ж гэта не ёсць шчасце?» [3, с. 11].

Прырода ў Коласа заўсёды цесна звязана з чалавекам, уплывае на яго настрой: то наводзіць смутак, то радуе сваёй прыгажосцю, бо «рытм коласаўскай прозы блізкі да рытму прыроды» [4, с. 37]. «Апошні раз расступіўся лес, і перад вачамі настаўніка раскрылася шырокая круглая палянка, вясёлая і прыветная. Лабановіч уздыхнуў лягчэй, як бы з яго плячэй зваліўся нейкі цяжар…».

Для трылогіі, на думку літаратуразнаўцы Т. І. Шамякінай, «у цэлым не характэрна сімвалічнасць. Але ў асобных выпадках чыста зрокавы вобраз пераходзіць у філасофска-эпічнае абагульненне. Філасофскае адценне маюць у творы вобразы дрэва, дома, дарогі, хлеба» [5, с. 55].

Даволі часта сімвалічны змест набывае вобраз дарогі. У трылогіі словы «дарога», «дарожка» сустракаюцца прыкладна 270 разоў. Часта ўжываюцца лексемы «гасцінец», «шлях», «сцежка». Можна з упэўненасцю сказаць, што вобраз дарогі ў творы найбольш ужывальны. У слоўніку эпітэтаў беларускай мовы паняцце «дарога» падаецца ў некалькіх значэннях. Па-першае, дарога — паласа зямлі для язды. Па-другое, дарога — паход, паездка, падарожжа. Па-трэцяе, дарога — жыццёвы шлях, кірунак у развіцці народа, краіны [2]. Вобраз дарогі ў трылогіі шматфункцыянальны і дакладна выкарыстоўваецца ва ўсіх згаданых значэннях. Ён узнікае ў творы невыпадкова. Ён звязаны з сюжэтам твора. Галоўны герой Андрэй Лабановіч часта пераязджае з месца на месца і наогул любіць падарожжы. Амаль самы нармальны стан для Лабановіча — знаходзіцца ў дарозе. Яго прыцягвалі «неакрэсленыя далечы, маўклівыя і мудрыя ў сваёй задуменнасці» [4, с. 38]. Ён заўсёды спадзяецца ўбачыць нешта новае за заслонаю сінечы, у ім пастаянны інтарэс да новых мясцін і новага жыцця.

Вобраз дарогі выконвае ў творы некалькі функцый. Гэты сімвал робіць пейзаж дынамічным, маляўнічым, адухоўленым. Вобраз надае твору гістарызм і нейкую асаблівую шырыню, а таксама адлюстроўвае ўнутраны свет галоўнага героя, яго перажыванні, настрой, пачуцці. Наваколле ўздзейнічае на Лабановіча такім чынам, што спрыяе паглыбленню яго засяроджанасці.

«Знаходжанне ў дарозе, язда… цесна звязаны з роздумам герояў, са спробамі асэнсавання імі свайго становішча… Карціны пейзажу, асаблівасці надвор’я пэўным чынам уздзейнічаюць на адчуванні падарожных, часта нясуць сімвалічную нагрузку ў канцэптуальнай будове твора» [1, с. 23].

Вобраз дарогі пісьменнік вымалёўвае ўжо на першых старонках трылогіі. Асаблівасць характару Лабановіча заключалася ў тым, што, усталяваўшыся на адным месцы, ён марыць аб падарожжах, аб неабсяжных абшарах. Багатае ўяўленне настаўніка малюе новыя дарогі, трасфармуючы пры гэтым

© Богуш М. С., 2017

Рэпазіторый БарДУ

успаміны. «Як толькі заплюшчыў вочы, перад ім, як жывы, усплыў малюнак дарогі, якою ён ехаў да станцыі…» [3, с. 15]. Гэты вобраз супакойвае Лабановіча, калі вакол цемра, калі на душы так цяжка. Дарога трохі заспакоіла. Турботныя і невясёлыя думкі развеяліся, бо Лабановіч добра ведае, што гэта самае лепшае лякарства ад усіх напасцей.

Нескладана заўважыць, як прырода ўплывае на ўнутраны стан галоўнага героя, а можа, правільней сказаць, як па-рознаму ўспрымаюцца прыдарожныя малюнкі ў залежнасці ад настрою маладога настаўніка. «Прыроднае і псіхалагічнае ўвесь час суадносяцца, перагукваюцца адно з адным» [1, с. 21].

На пачатку трылогіі паўстае вобраз дарогі «траскай і караністай», але аздобленай вясёлымі палянкамі і прыгожымі паваротками. І тут жа «высокія тонкія бярозы мяшаліся з шэрымі ствадамі хвоі і прыдавалі характар маркоты і засмучэння ўсяму малюнку» [3, с. 17]. Часам нават цяжка прасачыць за рэзкімі зменамі настрою акаляючага асяроддзя, а значыць, і настрою Лабановіча. Вось ён у дарозе, радасны і шчаслівы ад кахання. «Штось прыемнае і радаснае ўлівалася яму ў душу ад гэтых новых малюнкаў і ад гэтага размашыстага бегу машыны». Настаўнік зачараваны вясёлымі палянкамі і сакавітымі хвойкамі, поўнымі ласкаю і цішынёй. Ды як можна не любавацца старасвецкімі шляхамі, гасцінцамі, нават маленькімі сцяжынкамі, калі ў іх столькі гармоніі, прывабнасці, загадкавасці, бо «ў кожнай дарогі і дарожкі былі свой характар, свой нораў» [3, с. 47]. А зусім праз кароткі час мы бачым Лабановіча зноў у дарозе, але на гэты момант пуста і няветла там. Дзе ж зніклі прыветныя павароты? Пакідаючы Цельшына, галоўны герой назірае статычныя, нерухомыя малюнкі: «лес, нерухліва развесіўшы свае галіны», «вятрак з занямелымі ў вячэрняй цішы крыллямі». «Дарога крута паварочвала» [3, с. 175], а разам з ёй і само жыццё настаўніка.

Перажыванні героя вельмі дакладна пераносяцца на малюнкі прыроды, калі Лабановіч ідзе на патаемны сход: «…на дарозе ціха і бязлюдна, асенні змрок насоўваецца борзда, звужаючы паземы і націскаючы на знямелыя далі». У гэтым эпізодзе кожны малюнак нясе сэнсавую нагрузку, апісваючы неспакой і трывогу настаўніка. Гэта і шэрае неба, і паліцэйскія будкі, і «капцы, дзе захавана бульба на гарэлку» [3, с. 336].

Сімвалічна напоўненым з'яўляецца вобраз лясной дарогі каля Смалярні, што «разгаліньвалася, дзялілася на дзве». Пайшоўшы па адной, Лабановіч бачыць «запушчаныя, маладаступныя нізіны — лужыны, заваленыя галлём». «Густая трава, дзікія кветкі закрывалі маладое пакаленне новага лесу, але ён падымаўся ўгору…». І зусім іншай выглядала другая дарога «з прыземістымі хвойкамі, пышнымі кусцікамі ядлоўцу», што прывяла да цудоўнага сада землеўласніка Сцяпанава. Усяго на кароткія імгненні чытач сустракаецца з вобразамі дарогі, лесу, з вартаўніком, што прыйшоў нібыта з мінулых гадоў, з чырвонымі яблыкамі, але колькі ўзнікае асацыяцый і з будучай рэвалюцыяй, і з перажыткамі мінулага, што «закрываюць маладое пакаленне», і з новай нарастаючай хваляй народнага незадавальнення.

Але вобраз дарогі ў творы аб пошуках месца ў жыцці часам набывае больш глыбокае значэнне. У Коласа звычайная дарога, сцяжынка сярод поля перарастае ў сімвал шырокага жыццёвага шляху [4, с. 37].

«Ад рэфлістычнага ўвасаблення ў рэальным пейзажы да самага вышэйшага плана абагульнення — дарога — шлях пошукаў, шлях інтэлігенцыі, шлях народа ў будучае, у рэвалюцыю» [5, с. 56]. Дарога — гэта сімвал руху наперад, сімвал надзей на лепшую будучыню.

Як выйсці на правільную дарогу? Такое пытанне часта задае сабе малады настаўнік. Але хто можа яго навучыць? Хіба тыя самыя дарогі, «якія маглі прывесці да выйсця з гэтага зачараванага кола». «Трэба было саматугам працярэбліваць дарогі, а дзеля гэтага трэба было ўзысці на іх» [3, с. 183]. Шмат часу спатрэбілася настаўніку, каб выйсці на шлях свабоды і незалежнасці. Колькі сумненняў, няўпэўненасці, страху перад нябачным, але жаданым. «Шмат на гэтай дарозе ям і калдобін, але калі ты чэсны і свядомы чалавек, не бойся, не адступайся ад праўды» [3, с. 504]. І толькі калі прайшоў шматлікія перашкоды, «яму здалося, што ён зараз стаіць на вернай дарозе: стварыць настаўніцкую рэвалюцыйную арганізацыю і весці барацьбу па пэўнай праграме» [3, с. 401].

**Заключэнне.** Аўтар надае гэтаму паняццю значэнне руху наперад, значэнне надзеі на нешта лепшае, на лепшую будучыню. Каб выйсці на правільны шлях, шлях незалежнасці і свабоды, Лабановічу спатрэбілася шмат часу. Перацярпеўшы шматлікія перашкоды, Андрэй зразумеў, што «добра быць у дарозе, якую ты сам сабе выбіраеш» [3, с. 465]. Такім чынам, мы бачым, што асноўным у вандраванні Андрэя Лабановіча «па новых дарогах» застаецца верыць, спадзявацца, жыць…

**Спіс цытуемых крыніц**

1. *Гараднiцкі, І.* Вобразы дарогі і падарожных у трылогіі І. Мележа / І. Гараднiцкі // Роднае слова. — 2003. — № 4. — С. 22—25.
2. *Гаўрош, Н. В.* Слоўнік эпітэтаў беларускай мовы / Н. В. Гаўрош. — Мінск : Выш. шк., 1998. — 603 с.
3. *Колас, Я.* На ростанях / Я. Колас. — Мінск : Маст. літ., 2000. — 383 с.
4. *Тамашова, Л. Ф.* Вывучэнне трылогіі Я. Коласа «На ростанях» у школе / Л. Ф. Тамашова. — Мінск : Нар. асвета, 1976. — 112 с.
5. *Шамякіна, Т. І.* Вобразы мілага роднага краю / Т. І. Шамякіна. — Мінск : Беларус. навука, 2004. — 171 с.

Рэпазіторый БарДУ